УДК 908:06(476)«1920»

А. У. Дзянісаў, асістэнт (БДТУ)

# НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДДЗЕЛАЎ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ БЮРО КРАЯЗНАЎСТВА Ў БССР У СЯРЭДЗІНЕ 1920-Х ГГ.

Артыкул закранае тэму краязнаўчай дзейнасці нацыянальных меншасцей у БССР у сярэдзіне 1920-х гг. Разглядаецца станаўленне, генезіс і дзейнасць нацыянальных аддзелаў і секцый пры Цэнтральным бюро краязнаўства ў Інстытуце беларускай культуры БССР. Як найбольш яскравы прыклад пры даследаванні былі ўзяты яўрэйскія аддзелы і іх супрацоўніцтва з добраахвотнымі краязнаўчымі арганізацыямі БССР.

In the modern Belarusian historical science theme of local history of national minorities in 1920-th is not investigated. However, the topic is of great interest to get a complete picture of local history work in the Soviet republic of Belarus. Now, in a world of globalization and its negative effects, intensified intercultural and inter-national conflicts more important than ever to maintain of peaceful existence traditions. Belarus has always been an example of peaceful coexistence of different nationalities and a tolerant attitude towards other cultures. That is why the study of local history of national divisions and sections of the Belarusian Academy of Sciences in 1920-th is very important for local history theme of motion. This article describes the new views on the direction of the national organizations of local history in this period. The most striking example were taken Jewish department at the Academy of Sciences and the Jewish section of the Central Bureau of Local History

**Уводзіны.** Беларусь заўсёды была краінай, дзе гарманічна і мірна ўжываліся прадстаўнікі розных нацыянальнасцей і культур. Прыклады сумеснай дзейнасці ў навуковым, сацыяльным і дзяржаўным будаўніцтве, асабліва па вывучэнню культуры і гісторыі, заслугоўваюць падрабязнага даследавання і асвятлення.

Краязнаўчы рух, які актыўна дзейнічаў у 20-я гг. XX ст. у БССР, быў непасрэдна звязаны з працай вышэйшых навуковых і адукацыйных устаноў. Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК), якое ажыццяўляла каардынацыю працы краязнаўчых арганізацый на месцах, аказвала матэрыяльную і метадычную дапамогу, дзейнічала непасрэдна пры Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульт) на правах пастаяннага аддзела. ЦБК цесна супрацоўнічала з усімі навуковымі секцыямі і аддзеламі Інбелкульта. Асабліва актыўна ішло супрацоўніцтва з нацыянальнымі аддзеламі, у першую чаргу, яўрэйскім і польскім. Пры гэтых аддзелах дзейнічалі філіялы бюро, якія таксама ажыццяўлялі краязнаўчую працу па вывучэнню нацыянальных асаблівасцей. Раней краязнаўчая дзейнасць нацыянальных аддзелаў не вывучалася як самастойная тэма.

У дадзеным артыкуле ў якасці прыклада працы нацынальных секцый краязнаўства была ўзята праца яўрэйскай секцыі, якая ў азначаны перыяд дзейнічала найбольш актыўна.

**Асноўная частка.** 23 лістапада 1921 г. камісія па штатах пры Народным камісарыяце працы БССР зацвердзіла штат Інбелкульта ў колькасці 45 чалавек, а 30 студзеня 1922 г. адбыўся агульны сход яго супрацоўнікаў. На сходзе было прынята рашэнне аб утварэнні этнографалінгвістычнай і прыродазнаўчай секцый. У асобны склад Інбелкульта ўваходзілі ганаровыя і правадзейныя члены, навуковыя супрацоўнікі і члены-карэспандэнты [1, с. 9–10]. Былі створаны нацыянальныя сектары (яўрэйскі і польскі), якія пазней ператварыліся ў аддзелы.

З першых жа тыдняў існавання Інбелкульт пачаў вырашаць праблемы народнай адукацыі, падрыхтоўкі беларускамоўных падручнікаў для вучняў і студэнтаў, выпрацоўкі ў гэтых мэтах беларускай тэрміналогіі ва ўсіх галінах ведаў.

У канцы 1923 г. пры Інбелкульце з’явілася Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК), пры якім з 1925 г. пачалі дзейнічаць нацыянальныя секцыі (яўрэйская і польская).

7 мая 1926 г. ЦК КП(б)Б прыняў рэзалюцыю, у якой сярод іншых пунктаў планавалася дапамагаць арганізацыі акруговых краязнаўчых музеяў грамадскімі сіламі, улічваючы сродкі мясцовых каштарысаў на гэта, арганізаваць працу школьна-краязнаўчай камісіі, польскай і яўрэйскай секцый ЦБК [3, арк. 8]. Гэтыя рашэнні пацвердзіліся на Першым Усебеларускім краязнаўчым з’ездзе, дзе краязнаўчай працы нацыянальных меншасцей адводзілася асобнае месца.

На Другім Усебеларускім краязнаўчым з’ездзе названыя напрамкі былі замацаваны ў пунктах рэзалюцыі, якую прыняў прэзідыум з’езда.

У 1927 г. пачалася рэарганізацыя Інбелкульта ў вышэйшую навукова-даследчую ўстанову акадэмічнага тыпу. У працэсе рэарганізацыйнай працы быў складзены новы статут, які зацвердзіў СНК БССР 29 чэрвеня 1927 г. Арганізацыйная структура была перабудавана, а ўстановы, якія існавалі ў складзе Інбелкульта, былі

рэфармаваны паводле прынцыпаў і задач, абумоўленых новым статутам [2, арк. 34].

Усе ўстановы Інстытута аб'ядналіся ў два асноўныя аддзелы – аддзел прыродных і аддзел гуманітарных навук. Былі вылучаны два нацыянальныя аддзелы – яўрэйскі і польскі. Згодна са статутам, ЦБК з'яўлялася адной з тых устаноў, якія павінны былі абслугоўваць усе аддзелы і секцыі Інбелкульта (разам з друкарней, вайсковай камісіяй і інш.) і падпарадкоўвацца непасрэдна прэзідыуму Інбелкульта. Згодна з пастановамі ЦК КП(б)Б аб беларусізацыі, пільная ўвага павінна была ўдзяляцца развіццю культуры нацыянальных меншасцей.

Гэта тычылася, у першую чаргу, яўрэйскай і польскай культур. Пры Інбелкульце былі ўтвораны нацыянальныя аддзелы – яўрэйскі і польскі. Яўрэйскі аддзел займаўся распрацоўкай пытанняў мовы, гісторыі, этнаграфіі і наогул развіццём яўрэйскай нацыянальнай культуры ў Беларусі. Аддзел складаўся з гістарычнай, фальклорнай, лінгвістычнай і сацыяльна-эканамічнай камісій. Паколькі краязнаўчая справа адыгрывала выключную ролю ў працы камісій, пры яўрэйскім аддзеле з'явілася пасада спецыяльнага інструктара краязнаўства [2, арк. 205–206].

Была запланавана арганізацыя яўрэйскай секцыі пры ЦБК, якая павінна была кіраваць усёй яўрэйскай працай па краязнаўству ў БССР. Сектар звярнуўся да яўрэйскіх школьных працаўнікоў з адозвай, заклікаючы прымаць удзел у збіранні неабходных матэрыялаў і ў агульнай працы па краязнаўству. Таксама быў запланаваны пераклад літаратуры па краязнаўству на яўрэйскую мову [1, арк. 207].

Згодна з гэтымі пунктамі, у 1927 г. пры ЦБК была ўтворана яўрэйская секцыя краязнаўства, якая ажыццяўляла каардынацыю зборам матэрыялаў і вывучэннем яўрэйскай культуры краязнаўчымі арганізацыямі рэспублікі [117, с. 64]. Адказным за сувязь паміж ЦБК і яўрэйскім аддзелам быў прызначаны Г. С. Аляксандраў. Гэты актыўны дзеяч супрацоўнічаў з ЦБК з самага пачатку яго заснавання, выконваў абавязкі карэспандэнта ЦБК, уваходзіў у школьнакраязнаўчую камісію. Згодна з распрацаваным планам працы, у 1928 г. яўрэйская секцыя ЦБК павінна была ажыццяўляць наступныя меры [7, с. 14].

У інструкцыйна-метадычнай працы былі распрацаваны і надрукаваны інструкцыі апісання мястэчка; інструкцыі па збіранню матэрыялаў народнай творчасці; этнаграфіі; для апісання і ажыццяўлення выпісак з пінкасаў, матэрыялаў па гісторыі рэвалюцыйнага руху яўрэяў у Беларусі; збіранню матэрыялаў па гісторыі народнай асветы яўрэяў у Беларусі, апрацоўцы прысланых матэрыялаў апісання мястэчка Нароўлі. Разам з Наркаматам асветы быў распрацаваны ліст аб краязнаўстве ў яўрэйскай школе. У арганізацыйнай працы праводзілася наступнае: наладжвалася сувязь з яўрэйскімі секцыямі таварыстваў краязнаўства на месцах, арганізоўваліся новыя яўрэйскія секцыі ў найбольш вялікіх мястэчках.

Яўрэйская секцыя краязнаўства пры ЦБК праводзіла краязнаўчую працу з яўрэйскімі секцыямі пры БДУ і Педтэхнікуме, даследавала сацыяльна-эканамічнае становішча розных груп яўрэйскага насельніцтва ў г. Мінску. Прадстаўнікамі гэтай секцыі ажыццяўляўся інструктаж на месцах, прымаліся меры, каб змясціць матэрыялы па яўрэйскаму краязнаўству ў часопісе «Наш край». Яны бралі ўдзел у працы ЦБК, пасяджэннях пленума, прэзідыума і камісій. Згодна з комплексным вывучэннем Асіповіцкага раёна краязнаўчымі таварыствамі, ажыццяўлялася краязнаўчае вывучэнне сацыяльна-эканамічнага становішча мястэчак Асіповічы і Ясень [4, с. 140].

Усяго на працягу 1926–1928 гг. яўрэйскім аддзелам у справе краязнаўства былі арганізаваны яўрэйскія секцыі ў краязнаўчых арганізацыях БССР (да 40 секцый), разасланы шэраг інструкцый па збіранню матэрыялаў і даследаванню яўрэйскіх мястэчак, праведзена даследчая экспедыцыя ў Нароўлю. Інструктар краязнаўства яўрэйскага аддзела прымаў удзел у працы камісіі Джяржплана па даследаванню мястэчак, у нарадах Глаўнавукі, праводзіў працу ў краязнаўчым гуртку БДУ [2, арк. 210].

З дапамогай працы інструктара краязнаўства, краязнаўчай секцыі ЦБК і краязнаўчых таварыстваў рэспублікі камісіі яўрэйскага аддзела атрымалі неабходныя матэрыялы для даследавання.

Было сабрана 900 яўрэйскіх народных песен, 2800 анекдотаў, 24 500 прыслоўяў, каля 800 казак, шматлікі лексікон па рамёствах, калекцыя савецкага фальклору і іншае, для яўрэйскага акадэмічнага слоўніка сабрана каля 185 000 слоў, для дыялектычнага атласу – 5000 картак, выдадзены матэматычная і юрыдычная тэрміналогіі і падрыхтаваны да друку сельскагаспадарчая і хімічная [5, с. 51–52]. Сацыяльна-эканамічная камісія падрыхтавала 2 вялікія працы па стану калектыўнага і прыватнага яўрэйскага земляробства ў БССР, працы па яўрэйскаму насельніцтву, яўрэйскай рабочай моладзі [3, с. 65]. Гістарычнай камісіяй з месцаў было атрымана некалькі каштоўных пінкосім (кніг) [3, с. 64].

У пачатку 1928 г. яўрэйскім сектарам, як і іншымі аддзеламі і секцыямі Інбелкульта, быў распрацаваны пяцігадовы (1928/1929–1931/1932) план працы. Згодна з гэтым планам, штат супрацоўнікаў камісій яўрэйскага аддзела планавалася пашырыць, а працу весці больш комплексна.

У 1930/1931 г. планавалася паглыбіць супрацоўніцтва з ЦБК і краязнаўчымі таварыствамі і, як вынік гэтага супрацоўніцтва, атрымаць большую колькасць матэрыялаў з месцаў [2].

У выдавецкай працы планавалася выданне падручніка па краязнаўству на яўрэйскай мове, які б уключаў інструкцыйны матэрыял і метадычныя артыкулы. Такія ж самыя меры праводзіліся і ў польскім аддзеле Інбелкульта, аднак больш падрабязныя дакументы не захаваліся. Гістарычная і этнаграфічная камісіі цесна супрацоўнічалі з ЦБК [6, с. 65].

У 1929/1930 г. у сувязі з рэарганізацыяй Інбелкульта ў Беларускую Акадэмію навук (БАН) замест нацыянальнага яўрэйскага аддзела быў утвораны яўрэйскі сектар БАН, праца яўрэйскай секцыі ЦБК працягвалася ранейшымі тэмпамі.

У 1930 г. пры змене склада кіраўніцтва прэзідыума ЦБК прадстаўніком ад яўрэйскага сектара БАН па-ранейшаму застаўся Г. С. Аляксандраў [8, арк. 81].

**Заключэнне.** Такім чынам, краязнаўчая праца нацыянальных меншасцей па даследаванню культуры, мовы, фальклору, гісторыі, эканамічных і сацыяльных асаблівасцей іграла важную ролю ў развіцці краязнаўчага руху ў БССР у 20-я гг. XX ст. Аб важнасці і шырыні маштабаў дзейнасці яўрэйскай секцыі ЦБК гаворыць тое, што ў сярэдзіне 1920-х гг. усе краязнаўчыя арганізацыі Савецкай Беларусі ў сваёй працы падзяляліся на 3 асноўныя секцыі (прыродна-геаграфічная, грамадска-эканамічная і культурна-гістарычная), вылучаліся таксама секцыі па нацыянальнай (яўрэйская і польская) і школьнай справе (школьная).

Трэба адзначыць, што развіццю краязнаўчай дзейнасці нацыянальных меншасцей спрыяла не толькі палітыка беларусізацыі і карэнізацыі, якую праводзіла ЦК КП(б) Беларусі. У першую чаргу, паспяховасць залежала ад арганізацыі і дзейнасці нацыянальных секцый пры ЦБК, якія наладжвалі сувязь з аддзеламі і сектарамі Інбелкульта, а затым і БАН для сумеснай працы.

Сярод напрамкаў, у якіх ажыццяўлялася дзейнасць нацыянальных аддзелаў разам з ЦБК, можна вылучыць дзве асноўныя групы. Да першай адносіцца дзейнасць па вывучэнню гістарычных асаблівасцей: фальклору, культуры, звычаяў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, збіранне этнаграфічных даных. Напрамкі першай групы найбольш актыўна разгортваліся ў сярэдзіне 1920-х гг.

Да другой групы належаць даследаванні эканамічнага і гаспадарчага развіцця раёнаў, дзе пражывалі нацыянальныя меншасці. Такое вывучэнне форм зямельнага карыстання, уласнасці, выяўленне ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця. Галоўнае месца тут адводзілася выяўленню змен, якія адбыліся пад уздзеяннем савецкага будаўніцтва. Гэтыя напрамкі ў краязнаўчай працы пачынаюць дамінаваць у канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг., што было выклікана зменамі ў сацыяльным, эканамічным і грамадскім жыцці дзяржавы.

### Літаратура

1. ЦНА НАНБ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 26. Материалы Центрального бюро краеведения за 1928 г. – 290 л.
2. ЦНА АНБ. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 35. Материалы, планы, отчеты и другие документы Института белорусской культуры. – 1928–1929 гг. – 224 л.
3. НАРБ. – Фонд 4 п. – Воп. 1. – Спр. 2536. Протоколы № 24–43 закрытых заседаний бюро и секретариата ЦК КП(б)Б, документы к ним. – 2 апреля – 30 июня 1926 г. – 215 л.
4. Дзейнасць яўрэйскай секцыі пры ЦБК // Наш край. – 1927. – № 5. – С. 64.
5. Краязнаўчая праца яўрэйскага сектара Інбелкульта // Наш край. – 1928. – № 3. – С. 51–52.
6. Яўрэйская краязнаўчая секцыя ЦБК // Наш край. – 1929. – № 4. – С. 64.
7. Яўрэйскі этнаграфічны сектар ў Менску // Наш край. – 1929. – № 4. – С. 65.
8. Часопіс яўрэйскага сектара БАІ: гістарычны і сацыяльна-культурны аддзелы: у 4 т. – Менск: Выданне БАН, 1930. – Т. 4. – 344 с.
9. ЦНА АНБ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 6. Протоколы заседаний президиума Академии наук БССР. – 272 л.

*Паступіў 02.04.2010*